«Ельня», дзе знаходзіцца адзін з самых вялікіх у Еўропе масіваў старадаўніх вярховых балот і ледавіковых азёр *(Паводле сайта Belarus.by)*.

Выпішыце з тэксту ўласныя назвы. Што яны абазначаюць? Падкрэсліце вялікую літару ў назоўніках. Растлумачце яе правапіс.

Спішыце першы сказ, разбярыце яго па членах сказа, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Якімі членамі сказа з'яўляюцца назоўнікі?

Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, складзіце для аднакласнікаў паведамленне пра Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» або Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Ельня» на тэму «Запрашаю вас у падарожжа па...».

**166.** Спішыце верш, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце ўласныя назоўнікі, растлумачце правапіс вялікай літары.

**На ўроку геаграфіі**

— Пакажы мне *(Е/е)*нісей.
Як той слуп, стаіць *(М/м)*ацвей.
— Ну, а *(В/в)*олга, *(В/в)*олга дзе?
— Ды няма яе н..дзе.
— *(С/с)*віслач пакажы яшчэ.
— *(С/с)*віслач? Вунь яна ц..чэ.
Праз *(ва/а)*кно яна відаць,
Мне н..цяжка паказаць.

*А. Дзеружынскі.*



## § 25. Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя

**167.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю і тыпу маўлення ён адносіцца? Абгрунтуйце стылістычную ролю назоўнікаў у тэксце.

**Крыўда**

Вярнуўся Косця са школы надзьмуты і сярдзіты.

— Ты што сёння такі? — спытала мама.

— Мне настаўніца паставіла дрэнную адзнаку, — адказаў хлопчык. — За ката.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Косцік разгарнуў сшытак і паказаў намаляванага ката. Кот быў прыгожы: хвост трубою, поўсць паласатая і вусы, як у тыгра.

— Добры кот, — сказала мама. — Ты, можа, дрэнна паводзіў сябе на ўроку малявання?

— Не, — адказаў Косця. — У нас сёння не было малявання. Я на ўроку матэматыкі ката маляваў *(Паводле В. Хомчанкі)*.

Выпішыце з тэксту па два назоўнікі, якія адносяцца да наступных сэнсавых груп: 1) назвы асоб; 2) назвы жывёл; 3) назвы канкрэтных прадметаў.

!

**Адушаўлёныя** назоўнікі — гэта агульныя назвы людзей, жывёл, жывых істот *(беларус, дзіця, рыба, дрозд, муха)*, а таксама назвы міфалагічных, фантастычных істот *(Зеўс, лесавік)*, дзіцячых цацак *(лялька, мядзведзь)*, шахматных фігур *(слон, ферзь)*, якія адказваюць на пытанне х т о?.

**Неадушаўлёныя** назоўнікі — гэта назвы прадметаў *(аловак, машына)*, прылад *(рыдлёўка, станок)*, рэчываў *(мёд, алей)*, пачуццяў *(любоў, пяшчота)*, раслін *(васілёк, вярба)*, з'яў прыроды *(гром, снег)*, якія адказваюць на пытанне ш т о?.

**168.** Прачытайце назоўнікі.

| Ш т о? | Х т о? |
|---|---|
| стол | слон |
| атрад | сын |
| дуб | снегавік |

Паразважайце, якія словы называюць жывое ў прыродзе, а якія — нежывое.

Запішыце назоўнікі ў форме вінавальнага склону, абазначце канчаткі.

Дакажыце, што назоўнік *атрад* адносіцца да неадушаўлёных назоўнікаў, хоць і абазначае сукупнасць асоб, а назоўнік *снегавік* адносіцца да адушаўлёных назоўнікаў.

Форма вінавальнага склону неадушаўлёных назоўнікаў супадае з формай назоўнага склону: Н. скл. = В. скл.: *атрад*.

Форма вінавальнага склону адушаўлёных назоўнікаў супадае з формай роднага склону: Р. скл. = В. скл.: *снегавіка*.

**169.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку. Як вы разумееце назву тэксту?

## Хто вінаваты

Міша ніяк не мог зразумець, чаго ад яго хочуць і што ён такое зрабіў. Падумаеш, у абед скарыначкай хлеба запусціў у сабаку Рубіка, каб не сумна было абедаць. Толькі бабуля з дзядулем перасталі есці, а потым дзядуля ціха сказаў:

— Прасі прабачэння...

Хлопчык незадаволена надзьмуўся і прамармытаў:

— Даруйце... Я болей не буду...



— Не-не, не ў нас прасі прабачэння, — паспяшаўся спыніць унука дзядуля.

— Даруй мне, Рубік, — звярнуўся хлопчык да Рубіка, які вінаватымі вачыма сачыў за ўсім, што адбывалася на кухні.

— Ты і зараз, мусіць, не зразумеў. У хлеба прасі прабачэння.

Як можна прасіць прабачэння ў хлеба?! Хлопчык падняў скарыначку і заплакаў: ён не ведаў, хто вінаваты *(Паводле А. Жука)*.

Выпішыце з тэксту адушаўлёныя назоўнікі. Растлумачце правапіс вялікай літары ў некаторых з іх.

Як бы вы патлумачылі Мішу, за што ён павінен прасіць прабачэння ў хлеба? Падрыхтуйце вуснае выказванне.

Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, падрыхтуйце вуснае паведамленне на адну з прапанаваных тэм: «Славіць родны край беларускі каравай» або «Гэта ўсім вядома: хлеб — жыцця аснова». Уключыце ў сваё выказванне звесткі пра тое, які шлях праходзіць зерне ад таго, як трапляе ў зямлю, да бохана хлеба, які ляжыць на стале.

! **Асабовымі** называюцца адушаўлёныя назоўнікі, да якіх адносяцца назвы асоб па сацыяльнай і нацыянальнай прыналежнасці *(рабочы, беларус)*, прафесіі і родзе дзейнасці *(урач, студэнт)*, роднасці, сваяцтве *(брат, бацька)*, месцы жыхарства *(гараджанін, мінчанка)*, розных якасцях *(весялун, патрыёт)*.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**170.** Спішыце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Падкрэсліце адушаўлёныя назоўнікі, якія абазначаюць асобу.

1. Лепш дзесяць прыяцеляў, чым адзін вораг. 2. Вада сябра лепшая за мёд ворага. 3. Мудрэц свайго розуму не паказвае. 4. Блізкі сусед лепшы за дальняга родзіча. 5. Дзе маці нарадзіла, там і радзіма. 6. Лепш у сваякоў з голаду памерці, чым у чужакоў золата збіраць.

## § 26. Назоўнікі канкрэтныя і абстрактныя

**171.** Прачытайце верш.



Колькі той **радасці** ў чалавека!
Болей работы, **трывогі, турбот**...
Ды сустракае вясною спрадвеку
З радасцю чыстай ён птушак прылёт...
Сёння мне зранку працуецца весела:
Стукнула звонка ў шыбу **пчала,**
**Ластаўка смутак крылом** перакрэсліла,
**Ліпа** цвісці на двары пачала.

*П. Панчанка.*

Запішыце выдзеленыя назоўнікі ў пачатковай форме. Якія з іх спалучаюцца са словамі *два, дзве*? Запішыце гэтыя спалучэнні. Чаму некаторыя назоўнікі нельга палічыць?

Як вы разумееце выраз *працуецца весела*? Як вы думаеце, калі чалавеку весела працаваць?

! Усе агульныя назоўнікі падзяляюцца на **канкрэтныя** і **абстрактныя.**

**172.** Прачытайце табліцу. Адкажыце на пытанні:

1. Якія назоўнікі адносяцца да канкрэтных?
2. Якія назоўнікі адносяцца да абстрактных?
3. Як адрозніць канкрэтныя назоўнікі ад абстрактных па марфалагічных прыметах?